http://edoc.bseu.by

3 Непогодий, А. В. Интерпретативная теория Рональда Дворкина // Толкование закона и права. Том 1 [Электронный ресурс]. – Санкт–Петербург : Алетейя. – Режим доступа: https://law.wikireading.ru /9198?ysclid=lak0ywo2sb59319956. – Дата доступа: 16.11.2022

4 О правах всерьез / Пер. с англ.; ред. Л. Б. Макеева. – М. : «Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 2004. – 392 с.

5 Dworkin, R. M. The Model of Rules : [Electronic resourse] / Ronald M. Dvorkin. – 1967. – Mode of access: https://chicagounbound.uchicago.edu/cgi/viewcontent.cgi?article=3553&context=uclrev. – Date of access: 15.11.2022.

***К.Д. Канюшко, А.Л. Дуброўская***
БДЭУ(Мінск)

## ПРАВАРАЗУМЕННЕ ПЕРЫЯДУ РАЗГОРНУТАГА БУДАУНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМА — КРАЙНЯЯ ФОРМА ЭТАТЫСЦКАГА ПАЗІТЫВІЗМА

Прававая культура грамадства, як і культура ў цэлым, служыць адным з паказчыкаў яго цывілізаванасці: працэс узнікнення і развіцця права працякае ў кантэксце развіцця прыроды грамадства. Праваразуменне як феномен непарыўна звязана з дзеючым палітычным рэжымам, і, у першую чаргу, таму, што палітычная ідэалогія расстаўляе ў праве прыярытэты паміж інтарэсамі дзяржаўнай улады і грамадскімі інтарэсамі, натуральна, абараняючы ў першую чаргу інтарэсы кіруючых колаў грамадства. Праваразуменне перыяду разгорнутага баудаўніцтва сацыялізма (1921 – 1940 гг.) фарміравалася ў кантэксце сапраўды значных падзей. Гэта перыяд, калі пачалася новая эканамічная палітыка (1921 – 1928 гг.); была прынята першая Канстытуцыя СССР (1924 г.), паводле якой улада заснавана на прынцыпе дыктатуры пралетарыяту і якая прызнае грамадскую ўласнасць на зямлю і сродкі вытворчасці; была праведзена фінансавая рэформа (1922 – 1924 гг.); СССР уступіла ў Лігу Нацый (1934 г.) [6, с. 78] і шмат інш.

Праваразуменне вышэйапісанага перыяду звязана з такім паняццем, як этатызм. Этатызм — гэта такі кірунак палітычнай думкі, які разглядае дзяржаву як вышэйшы вынік і мэту грамадскага развіцця [2, с. 737]. Мэта работы — вывучыць такі ідэалагічны накірунак палітычнай думкі, як этатызм, і растлумачыць, у чым сутнасць падобнага тыпу праваразумення.

Пачатак XX ст. для Расійскай імперыі быў смутным часам, поўным насілля як з боку пралетарска-сялянскіх мас, так і з боку самадзяржаўнай улады, якая задушыла першую рэвалюцыю з асаблівай жорсткасцю. У прававой навуцы стварылася спрыяльная сітуацыя для этатысцкага пазітывізму з яго праваразуменнем, якое грунтавалася на ідэях дзяржаўнага прымусу. Найбольш яркім прадстаўніком этатысцкага пазітывізму новай хвалі стаў Г.Ф. Шаршаневіч (1863 – 1912 гг.). Яго кніга “Общая теория права” 1910-1912 гг. выйшла напярэдадні Першай сусветнай вайны, а яе палажэнні, прасякнутыя пафасам этатызму, гучалі вельмі палемічна. “Права, — пісаў Шаршаневіч, — есть

функция государства” [1, с. 144]. Таксама ён разважаў аб тым, што этатысцкі пазітывізм з’яўляецца першай па часе формай развіцця пазітывісцкай метадалогіі ў расійскім правазнаўстве. Сутнасць яго заключаецца ў тэзе аб тым, што ўсё права зыходзіць ад дзяржавы. Устаноўленасць дзяржавай дае праву прымусовую сілу ў выглядзе санкцый за невыкананне нормы. На думку вучонага, без такіх санкцый аб праве гаварыць нельга.

Афіцыйнае праваразуменне ў СССР знайшло сваё адлюстраванне ў рашэннях “I Совещания по вопросам науки советского государства и права” (16.07 — 19.07.1938 г.). Несумненна, тут відавочны ўнёсак Андрэя Вышынскага (1883 – 1954), савецкага правазнаўцы і дзяржаўнага дзеяча, доктара юрыдычных навук, Пракурора СССР (1935 – 1939), члена ЦК ВКП(б), а пазней міністра замежных спраў СССР (1949 – 1953). У дакладзе Вышынскага адсутнічала вызначэнне савецкага права, але гаварылася, што аналіз савецкага права з пункту гледжання агульнага вызначэння (“Право — совокупность правил поведения, установленных государственной властью, как властью господствующего в обществе класса, а также санкционированных государственной властью обычаев и правил общежития, осуществляемые в принудительном порядке при помощи государственного аппарата в целях охраны, закрепления и развития общественных отношений и порядков, выгодных и угодных господствующему классу”) [3, с. 38], дае магчымасць раскрыць сацыялістычны змест савецкага права, яго актыўна-творчую ролю ў барацьбе за сацыялістычны лад, за пераход да камунізму. У канчатковай рэдакцыі тэзісаў дакладу А.Я. Вышынскага, ухваленых “I Совещанием по вопросам науки советского государства и права”, даецца наступнае азначэнне савецкага права: “Савецкае права ёсць сукупнасць правіл паводзін, усталяваных у заканадаўчым парадку ўладай працоўных, якія выказваюць іх волю і ўжыванне якіх забяспечваецца ўсёй прымусовай сілай сацыялістычнай дзяржавы, у мэтах абароны і развіцця адносін і парадкаў, выгадных і заўгодных працоўным, поўнага і канчатковага знішчэння капіталізму і яго перажыткаў у эканоміцы, побыце і свядомасці людзей, пабудовы камуністычнага грамадства” [5, с. 39].

Несумненна, развянчанне культу асобы Сталіна спрыяла павышэнню ўвагі навукоўцаў да феномену суб’ектыўнага права СССР 1950-х гадоў. Але, мабыць, самае негатыўнае ў тэарэтычнай творчасці Сталіна заключаецца ў тым, што ён фактычна адкінуў гуманістычную сутнасць сацыялізму, паступова абгрунтаваў, калі так можна выказацца, “ахвярны сацыялізм”. Гэтыя светапоглядныя ўстаноўкі Генеральнага сакратара з часам дазволяць яму з лёгкім сэрцам пайсці на нечуваныя масавыя рэпрэсіі, на шырокае прымяненне гвалту як галоўнага сацыяльнага рычага ў будаўніцтве сацыялізму. Па сутнасці, аналіз тэарэтычных поглядаў Сталіна і асабліва спосабаў і метадаў іх матэрыялізацыі дазваляе зрабіць выснову, што Генеральны сакратар паступова адышоў ад ленінізму. Сярод многіх разнавіднасцяў сацыялізму: утапічнага, дробнабуржуазнага, казарменнага, навуковага — Сталін стварыў нешта сваё. Яго сацыялізм — гэта сацыялізм бюракратычны, які нясе ў сабе рысы і дагматычнага, і казарменнага. Адным словам, — “сталінскі”. Але сёння мы ведаем, што лічыць

сацыялістычным грамадства, дзе толькі высокая ступень абагульвання, дзе калектыўнае вышэй асабістага, дзе ўсё плануецца “зверху”, нельга.

Такім чынам, этатысцкі пазітывізм з’яўляецца першай па часе формай развіцця пазітывісцкай метадалогіі ў расійскім правазнаўстве. Этатызм — гэта абсалютная ўсёабдымная з’ява, якая абумоўлівае стан найважнейшых характарыстык савецкай дзяржавы, грамадства, эканомікі і права, а таксама фактараў, якія ўплываюць на іх развіццё. Нягледзячы на тое, што тэарэтычна ў структуры пазітывізму вылучаюць шэраг канцэптуальных напрамкаў, такіх як марксізм, ленінізм, неапазітывізм (нарматывізм), легізм, — пры спробе рэалізацыі іх на рэальна існуючай дзяржаўнай глебе ўсе яны немінуча прымаюць форму этатызму. Таму ва ўмовах савецкай сацыялістычнай дзяржаўнасці, дзе дзяржава цалкам падпарадкоўвала сабе не толькі эканамічную, але і прававую сферу, укараненне крайняга пазітывізму было не проста заканамерна, а непазбежна.

Спіс літаратуры

1 Антонов, М. В. История правовой мысли России. Конспект лекций / М. В. Антонов; Санкт-Петербургский филиал Нац. исслед. ун-та «Высшая школа экономики». — СПб. : Отдел оперативной полиграфии НИУ ВШЭ, 2012. — 212 с.

2 Большая Советская Энциклопедия. Электрофор-Эфедрин. — Первое издание под ред. О. Ю. Шмидта : В 65-и т. – М. : ОГИЗ-Советская Энциклопедия, 1933. – Т. 64. – 800 с.

3 Вышинский, А. Я. Основные задачи науки советского социалистического права /А. Я. Вышинский // Вопросы теории государства и права. —2-е изд. —М.: Гос. изд-во юрид. лит-ры, 1949. — С. 37—40.

4 Иванов, И. В. Первый советский учебник по государственному праву 1938 г. под ред. А. Я. Вышинского / И. В. Иванов // История государства и права. — 2018. — № 11. — С. 55–60.

5 Сталин, И. Экономические проблемы социализма в СССР / И. Сталин. — М. : Госполитиздат, 1952. — 94 с.

6 Трудные вопросы истории России. XX — начало XXI века : учеб. пособие / А. Б. Ананченко [и др.]—М. : Моск. педаг. гос. ун-т, 2016. — Вып. 1. – 272 с.

***Е.С. Кулешова***
АУпПРБ(Минск)

## ПРАВОВОЕ РЕГУЛИРОВАНИЕ ПРАВ БЕЖЕНЦЕВ НА ТЕРРИТОРИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Политическая и экономическая нестабильность в различных регионах мира, которая выражается в войнах, вооруженных конфликтах,